**Список цитируемых источников**

1. *Венгер, Л. А.* Воспитание сенсорной культуры ребёнка : кн. для воспитателей дет. сада / Л. А. Венгер, Е. Г. Пилюгина. — М. : Просвещение, 1998.
2. *Урунтаева, Г. А.* Детская психология : учеб. для студентов образоват. учреждений сред. проф. образования / Г. А. Урунтаева. — 6-е изд., перераб. и доп. — М. : Академия, 2006.

УДК 378.3

**Пшаніцына Лідзія Аляксандраўна[1],** *кандыдат педагагічных навук,*
**Бухарцава Алена Мікалаеўна[2], Абрэўка Галіна Леанідаўна[2]**
*[1]Установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», Мінск, Рэспубліка Беларусь, lidaopen@gmail.com*
*[2]Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Дзіцячы сад № 137 г. Мінска», Мінск, Рэспубліка Беларусь, ddu137@minsk.edu.by*

# ВЫКАРЫСТАННЕ МУЛЬТЫСЭНСАРНАГА КОМПЛЕКСУ «Я — БЕЛАРУС» У ПАТРЫЯТЫЧНЫМ ВЫХАВАННІ ДЗЯЦЕЙ ДАШКОЛЬНАГА ЎЗРОСТУ

У артыкуле разглядаецца праблема прымянення мультысэнсарнага комплексу «Я — беларус» у працэсе патрыятычнага выхавання дзяцей дашкольнага ўзросту. Разгледжаны магчымасці мультысэнсарнага комплексу, якія садзейнічаюць фарміраванню ў дзяцей уяўленняў аб родным краі, .

**Ключавыя словы:** мультысэнсарны комплекс; патрыятычнае выхаванне; дзеці дашкольнага ўзросту.

**Pshenitsyna Lidiya Alexandrovna[1],** *Candidate of Pedagogical Sciences,*
**Bukhartseva Elena Nikolaevna[2], Obrevko Galina Leonidovna[2]**
*[1]Educational Institution "Belarusian State Pedagogical University named after Maxim Tank", Minsk, the Republic of Belarus, lidaopen@gmail.com*
*[2]State Educational Institution "Kindergarden № 137 of Minsk", Minsk, the Republic of Belarus, ddu137@minsk.edu.by*

# USE OF MULTI-SENSORY COMPLEX "I AM BELARUSIAN" IN PATRIOTIC EDUCATION OF PRESCHOOL CHILDREN

The article deals with the problem of using the multi-sensory complex "I am Belarusian" in the process of patriotic education of preschool children. The possibilities of the multisensarnag complex, which contribute to the formation of children's ideas about their native land, are considered.

**Key words:** multi-sensory complex; patriotic education; preschool children.

**Уводзіны.** У сучасных умовах з'яўляецца супярэчнасць паміж неабходнасцю далучэння дзяцей да традыцый роднай краіны, авалодання дзецьмі дашкольнага ўзросту беларускай мовай як роднай і пошукам новых тэхналогій, метадаў і прыёмаў патрыятычнага выхавання. Выходзячы з асаблівасцяў дзяцей дашкольнага ўзросту неабходна зрабіць гэты працэс, з аднаго боку, займальным, а з другога — больш эфектыўным.

На наш погляд, эфектыўным сродкам павышэння матывацыі і эфектыўнасці патрыятычнага выхавання можа стаць выкарыстанне мультысэнсарнага комплексу. Актуальнасць дадзенай праблемы абумоўлена тым, што ў групе прысутнічаюць выхаванцы з рознымі тыпамі ўспрымання, мыслення і памяці, а выкарыстанне мультысэнсарнага комплексу пры далучэнні дзяцей да традыцый роднай краіны дазваляе педагагічным работнікам зрабіць працэс навучання больш эфектыўным.

**Асноўная частка.** У Рэспубліцы Беларусь патрыятычнаму выхаванню дзяцей дашкольнага ўзросту, развіццю цікавасці да беларускай мовы ўдзелена вялікая ўвага ў вучэбнай праграме дашкольнай адукацыі (2022) у змесце адукацыйных абласцей «Дзіця і грамадства» («Пазнанне соцыума»), «Развіццё маўлення і культура маўленчых зносін» [1].

Значнае месца праблеме выхавання павагі дзяцей дашкольнага ўзросту да роднага краю і далучэння іх да беларускай мовы надаецца ў адукацыйным працэсе дзяржаўнай установы дашкольнай адукацыі «Дзіцячы сад № 137 г. Мінска». З гэтай мэтай педагогамі быў распрацаваны мультысэнсарны комплекс «Я — беларус», які грунтуецца на мультысэнсарным падыходзе, разлічаным на ўспрыманне і перадачу інфармацыі рознымі органамі пачуццяў адначасова, задзейнічаючы розныя каналы ўспрымання (зрокавы, слыхавы, кінэстэтычны і г. д.), што стварае ўмовы натуральных зносін у спецыяльна арганізаванай і нерэгламентаванай дзейнасці.

Мультысэнсарны падыход — гэта навучанне з апорай на каналы ўспрымання ўсіх органаў пачуццяў: слыху, зроку, дотыку, нюху, густу, што спрыяе больш лёгкаму ўспрыманню і запамінанню новага моўнага

© Пшаніцына Л. А., Бухарцава А. М., Абрэўка Г. Л., 2023



Репозиторий БарГУ

матэрыялу. Паняцце «мультысэнсарны» складаецца з двух слоў: «мульты» лац. multum шмат і «сэнсарны» лац. sensus успрыманне, пачуццё, адчуванне. У працэсе мультысэнсарнага навучання выхаванцы засвойваюць інфармацыю, уключаючы ўсе адчувальныя каналы ўспрымання: слых, зрок, дотык, нюх і густ. У аснову мультысэнсарнага падыходу пакладзена тэорыя Multiple Intelligences, распрацаваная Ховардам Гарднерам. Згодна гэтай тэорыі, людзі валодаюць неаднолькавымі тыпамі ўспрымання, мыслення і памяці [2, с. 234]. Вядома, што новая інфармацыя ўспрымаецца і запамінаецца рознымі людзьмі па-рознаму. У адных людзей лепш развіта зрокавая памяць (візуалы), у іншых — слыхавая (аудыялы), а трэція ўспрымаюць большую частку інфармацыі праз дотык і з дапамогай рухаў (кінестэцікі). Таму, для паспяховага ўспрымання матэрыялу выхаванцамі, якія валодаюць рознымі відамі памяці, неабходна выкарыстоўваць заданні і практыкаванні, якія дазваляюць актывізаваць усе каналы ўспрымання. Мультысэнсарны комплекс «Я — беларус» складаецца з каляндарна-тэматычнага планавання, канспектаў заняткаў па адукацыйнай вобласці «Развіццё маўлення і культура маўленчых зносін», мультысэнсарных карт, мультысэнсарных гульняў, «Гісторый ў руху», тэматычных слоўнікаў і мультысэнсарных альбомаў.

Для рэалізацыі мультысэнсарнага комплексу распрацавана каляндарна-тэматычнае планаванне з улікам мультысэнсарнага падыходу да развіцця беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту. У другой малодшай групе прадугледжваецца праслухоўванне дзецьмі беларускіх народных калыханак, песенек, забаўлянак, кароткіх вершаў, якое суправаджаецца адпаведнымі зместу дзеяннямі (закалыхванне лялек, пляскание ў далоні, прытупванне, падскокі), паўтарэннем гукаперайманняў, асобных слоў, выразаў. Расказванне невялікіх па аб’ёму казак суправаджаецца інсцэніроўкамі, што аблегчыць дзецям іх успрыманне і разуменне, заахвоціць да паўтарэння слоў, выразаў, песень, будзе спрыяць развіццю цікавасці да роднага краю. Згодна каляндарна-тэматычнаму планаванню, у сярэдняй і старшай групах праводзяцца гульні, заняткі па развіцці беларускага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту, заснаваныя на мультысэнсарным падыходзе. Выхавацелі дашкольнай адукацыі арганізуюць іх так, каб выхаванцы ўспрымалі інфармацыю па схеме «бачу—чую—раблю», «бачу—раблю—кажу», выкарыстоўваючы мультысэнсарныя карты, якія дазваляюць задзейнічаць як мага больш каналаў успрымання: зрок, слых, дотык і інш. Заданні мяняюцца рэгулярна, бо накіраваны на розныя каналы ўспрымання, што дае магчымасць зафіксаваць увагу дзяцей на вывучаемым аб’екце ці з’яве. Выкарыстоўваецца каманда «пакажы на…», паколькі рух пальцам па адпаведных малюнках кажа аб асэнсаваным успрыманні пачутага і з’яўляецца дадатковым каналам успрымання.

Мультысэнсарныя гульні выкарыстоўваюцца на працягу дня і спрыяюць замацаванню пройдзенага матэрыялу. Яны дапамагаюць развіццю цікавасці да славутасцяў роднага горада, павагі да гісторыі роднай краіны, выхаванню гукавай культуры маўлення, развіццю звязнага маўлення.

Шырока выкарыстоўваюцца мультысэнсарны мех «Сэнсамех» і мультысэнсарная скрыня «Сэнсаскрыня» як у спецыяльна арганізаванай так і нерэгламентаванай дзейнасці. Звычайна ў мультысэнсарным меху «Сэнсамех» змешчаны розныя прадметы, але могуць знаходзіцца і карцінкі. Першае, што робяць выхаванцы, — гэта дастаюць іх з меха, потым разглядаюць і называюць. Напрыклад, выкарыстоўваючы сэнсамех, можна прапанаваць наступныя гульні: «Назаві колер», «Прыдумай сказ», «Скажы, каго ты бачыш, што ты бачыш» (уменне адрозніваць форму вінавальнага склону), «Назаві адным словам» (замацоўванне абагульняючых паняццяў), «Які у каго голас» (пашырэнне слоўнікавага запасу па тэме «Хатнія жывелы»). У адрозненні ад мультысэнсарнага меху мультысэнсарная скрыня «Сэнсаскрыня» змяшчае яшчэ і сюжэтныя карцінкі. Першае, што робяць выхаванцы, — гэта глядзяць у акенца ці трубу, каб убачыць сюжэтную карцінку, якая і задае тэму занятка. Далей ідзе праца з прадметнымі карцінкамі і рэальнымі прадметамі. Альбо дзеці прасоўваюць рукі, абмацваюць прадмет, у акенцы яны бачаць тры аднолькавых па форме карткі прадметаў пры дапамозе разглядання якіх патрэбна назваць прадмет, размешчаны ніжэй. Выкарыстоўваючы мультысэнсарны мех і мультысэнсарную скрыню ў спецыяльна арганізаванай і нерэгламентаванай дзейнасці, выхаванцы першапачаткова толькі называюць прадметы, затым дзеянні з дадзенымі прадметамі, а потым прыкметы, што спрыяе ўзбагачэнню, замацаванню і актывізацыі слоўніка і адпрацоўцы граматычных формаў. Для таго, каб выхаванцы лепш запомнілі новае слова, умелі правільна яго выкарыстоўваць, тлумачыць яго значэнне, яно паўтараецца некалькі разоў на працягу пэўнага перыяду, ужываецца ў розных кантэкстах, а таксама розных відах дзейнасці. Тэматычныя слоўнікі накіраваны на ўзбагачэнне слоўніка выхаванцаў, яго замацаванне і актывізацыю. Яны складаюцца з улікам тэмы тыдня і адлюстроўваюць словы, з якімі выхаванцы пазнаёміліся ў спецыяльна арганізаванай дзейнасці. Мультысэнсарны альбом выкарыстоўваецца ў спецыяльна арганізаванай і нерэгламентаванай дзейнасці для развіцця звязнага маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту. Ён складаецца з некалькіх акенцаў: акенца, у якое ўстаўляецца карцінка з выявай пэўнага прадмета; акенца з алгарытмам складання апавядання пра дадзены прадмет; акенцы, якія змяшчаюць заданні для выканання. Мэтазгодна выкарыстоўваць мультысэнсарны альбом пры вывучэнні розных тэм, напрыклад, «Прыкметы восені, зімы, вясны і лета», «Мой родны край», «Мы — беларусы», «Беларускія цацкі» і інш.

**Заключэнне.** Прымяненне мультысэнсарнага комплексу «Я — беларус» мае станоўчы ўплыў на патрыятычнае выхаванне дзяцей старэйшага дашкольнага ўзросту: у дзяцей з’явілася цікавасць і эмацыйнае стаўленне да роднага краю і беларускай мовы, паглыбіліся ўяўленні аб традыцыях беларусаў, славутасцях, вялікіх людзях нашай краіны, народных промыслаў, прадметаў побыту беларусаў; сфармавалася перакананасць у неабходнасці беражлівых адносін да прыроды Беларусі.

Рэпазіторый БарДУ

**Спіс цытаваных крыніц**

1. Учебная программа дошкольного образования: для учреждений дошкольного образования с русским языком обучения и воспитания [Электронный ресурс] / М-во образования Респ. Беларусь. — Минск : Нац. ин-т образования, 2022. — Режим доступа: https://adu.by/images/2022/08/up-doshk-obrazov-rus-bel.pdf . — Дата доступа: 10.12. 2022.
2. *Нельзина, Е. Н.* Приёмы мультисенсорного обучения лексической стороне англоязычной речи в начальной школе / Е. Н. Нельзина, А. И. Волошина // Проблемы романо-германской филологии, педагогики и методики преподавания иностранных языков. — 2020. — № 16. — С. 233—237.

УДК 378

**Пыл Елена Васильевна**
*Государственное учреждение образования «Жемчужненский детский сад Барановичского района», аг. Жемчужный, Республика Беларусь, i.pyl@mail.ru*

## ВИРТУАЛЬНЫЕ ЭКСКУРСИИ КАК СРЕДСТВО ИЗУЧЕНИЯ РОДНОГО КРАЯ

В статье раскрываются преимущества виртуальных экскурсий как формы организации образовательного процесса, их виды и формы реализации. Представлен опыт организации виртуальных экскурсий как формы патриотического воспитания детей дошкольного возраста. Описывается система использования виртуальных экскурсий в образовательном процессе учреждения дошкольного образования.

**Ключевые слова:** патриотическое воспитание; виртуальная экскурсия; дошкольный возраст.

**Pyl Elena Vasilevna**
*State Education of Institution "Zhemchuzhnensky Kindergarten of the Baranovichi District", Zhemchuzhny, the Republic of Belarus, galikkatya@gmail.com, i.pyl@mail.ru*

## VIRTUAL EXCURSIONS AS A MEANS OF STUDYING THE NATIVE LAND

The article reveals the advantages of virtual excursions as a form of organization of the educational process, their types and forms of implementation. The experience of organizing virtual excursions as a form of patriotic education of preschool children is presented. The system of using virtual excursions in the educational process of preschool education institutions is described.

**Key words:** patriotic education; virtual excursion; preschool age.

**Введение.** Образовательные стандарты дошкольного образования требуют поиска и внедрения новых подходов в воспитании и обучении детей дошкольного возраста. Одним из таких подходов является информатизация дошкольного образования. Информатизация — это комплексный, многоплановый, ресурсоёмкий процесс, в котором участвуют и воспитанники, родители, педагогические работники, и руководство учреждения дошкольного образования. Создаётся единое информационное образовательное пространство учреждения дошкольного образования, активно используются интернет-ресурсы, информационные технологии, проектная и инновационная деятельность. Информатизация образования приобретает важное значение в условиях современного мира, постоянного совершенствования и изменения образовательных технологий.

**Основная часть.** В связи с внедрением новых информационных технологий в образовательный процесс учреждения дошкольного образования педагогическому работнику необходимо уметь проектировать занятия с использованием современных средств визуализации. Визуализацию следует понимать не только как принцип наглядности, но и как стимулирование мыслительной и познавательной деятельности детей дошкольного возраста. Эти средства помогают развивать красивую грамотную речь, уверенность в выступлениях на публике, творческое мышление, воображение, способствуют раскрытию талантов и самовыражению.

Экскурсия — форма организации образовательного процесса, позволяющая осуществлять наблюдения и изучение различных предметов и явлений в естественных условиях, на производственных предприятиях, выставках и др.; проводится она вне учреждения образования для непосредственного ознакомления воспитанников с изучаемыми объектами и явлениями, способствует развитию интереса к изучаемому предмету, обеспечивает практическую направленность образовательного процесса [1. с. 536].

Виртуальная экскурсия — организационная форма обучения, отличающаяся от реальной виртуальным отображением реально существующих объектов (музеи, парки, улицы города) в целях создания условий для самостоятельного наблюдения, сбора необходимых фактов.

© Пыл Е. В., 2023

Репозиторий БарГУ